Источник: "Навука" - 2017-02-20




# З днём роднай мовы!



**Штогод 21 лютага ва ўсім свеце пад эгідай ЮНЕСКА адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы, галоўнай мэтай якога з'яўляецца падтрыманне нацыянальных моў і культур, захаванне іх адметнасці і самабытнасці, забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай і стварэнне ўмоў для гэтага з боку дзяржаўных органаў улады.**

Сёлета, у Год навукі, асаблівае значэнне набывае навукова-практычнае забеспячэнне паспяховага функцыянавання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, у якіх павінна выкарыстоўвацца дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі. База для гэтага створана ў акадэмічным Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа, бо менавіта ён забяспечвае каардынацыю і правядзенне сістэмных навуковых даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства.

Напярэдадні Дня роднай мовы адкрыюцца навукова-асветніцкія курсы «Беларуская мова», на якіх наведвальнікі змогуць удасканаліць свае практычныя і тэарэтычныя веды ў галіне беларускай мовы, авалодаць навыкамі яе выкарыстання ў інфармацыйна-справаводчай, вытворча-тэхнічнай і іншых сферах.



17 лютага ў сталічным Доме прэсы прайшла прэс-канферэнцыя, прысвечаная Дню роднай мовы. 20 лютага ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа адбылася сустрэча са школьнікамі – пераможцамі III этапа Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове (*падрабязней гл. стар. 6*). Хлопцы і дзяўчаты пазнаёміліся з працай айчынных вучоных-моваведаў, наведалі аддзелы інстытута, абмеркавалі актуальныя праблемы развіцця лінгвістычнай навукі, што, паводле задумы арганізатараў, павінна паспрыяць не толькі ўдасканаленню ведаў і пашырэнню кругагляду навучэнцаў, але і выбару іх далейшага прафесійнага шляху.

Інтэрв'ю аўтара гэтых радкоў выйдзе ў часопісе «Роднае слова». У ім пойдзе гаворка пра ролю беларускай мовы як фактару падтрымання прэстыжу Беларусі як незалежнай славянскай краіны.

21 лютага ў 15.00 у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа будзе праведзены круглы стол «Мова ў навуцы, адукацыі, заканадаўстве» з удзелам прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, выкладчыкаў профільных навучальных устаноў сталіцы, прадстаўнікоў прэсы, вядучых супрацоўнікаў і маладых вучоных інстытута.

22 лютага ў 15.00 у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа адбудзецца прэзентацыя аднатомнага «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы», які быў падрыхтаваны калектывам лексікографаў інстытута. Новае выданне, якое працягвае і развівае традыцыі айчыннай лексікаграфіі, арыентавана на адлюстраванне сучаснага стану лексікі і фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы і адпаведна тых працэсаў, якія дэманструюць дынаміку развіцця сучаснай беларускай мовы. На прэзентацыю запрошаны студэнты навучальных устаноў, выкладчыкі, настаўнікі, прадстаўнікі навуковай і творчай інтэлігенцыі краіны, аматары жывога беларускага слова.

Член-карэспандэнт А.Лукашанец запрошаны ў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў, дзе падчас сустрэчы з курсантамі і выкладчыкамі раскажа аб сучаснай моўнай сітуацыі ў краіне і дасягненнях айчынных вучоных.

23 лютага на вучоным савеце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі пройдзе абмеркаванне тэмы «Актуальныя напрамкі сучаснага беларускага мовазнаўства».

24 лютага ў Мінскім абласным інстытуце развіцця адукацыі ў рамках адукацыйнай праграмы семінара настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ўстаноў сярэдняй адукацыі «Лічбавыя адукацыйныя рэсурсы і інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі ў выкладанні беларускай мовы і літаратуры» запланаваны лекцыі для настаўнікаў беларускай мовы з Мінскай вобласці, якія прачытаюць аўтар гэтых радкоў і загадчык сектара камп'ютарнай лінгвістыкі У.Кошчанка (ён раскажа пра электронныя рэсурсы, якія павінны прыйсці на дапамогу настаўніку).

У Выдавецкім доме «Беларуская навука» неўзабаве будуць апублікаваны тры знакавыя, шырока запатрабаваныя не толькі ў навуковым асяроддзі, але і адукацыйным працэсе акадэмічныя выданні: «Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы», «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (37 выпуск) і «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы» (14 том).

На працягу тыдня вядучыя вучоныя інстытута выступяць і перад грамадскасцю, па радыё і на тэлебачанні, возьмуць удзел у імпрэзах і святочных мерапрыемствах, што будуць арганізаваны дзяржаўнымі ўстановамі і грамадскімі арганізацыямі нашай краіны.

**Ігар КАПЫЛОЎ,**
дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі